КОНТРОЛЬНЫЙ ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка"

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_____________ А.В.Макоўчык
"___" _________ 2021 г.

Рэгістрацыйны №УД 11-1-24 /вуч.

# АСНОВЫ ЛІНГВІСТЫЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці

**1–02 03 01 Беларуская мова і літаратура**

2021 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі АСВА 1-02 03 01-2021, тыпавой вучэбнай праграмы, зацверджанай 03.06.2021 (рэгістрацыйны нумар ТД-А.728 ), вучэбнага плану па спецыяльнасці 1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура

**СКЛАДАЛЬНІК:**

С.У.Шахоўская, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Т.М.Чэчка загадчык кафедры беларускай і рускай філалогіі УА "Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П.Шамякіна", кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

М.Р.Прыгодзіч, загадчык кафедры беларускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар

**УЗГОДНЕНА:**

Дырэктар ДУА «Гімназія № 18 г. Мінска» ________ А.А.Венская

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай мовазнаўства і лінгвадыдактыкі філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

(пратакол № 5 ад 23 лістапада 2021 г.)

Загадчык кафедры ________ Д.В.Дзятко

Навукова-метадычным саветам ўстановы вышэйшай адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

(пратакол № 3 ад 22.12.2021 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст ВМА ________ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі ________ Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па дысцыпліне "Асновы лінгвістычных даследаванняў" прызначана для рэалізацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі ў межах цыкла спецыяльных дысцыплін і займае сярод іх важнае месца. "Асновы лінгвістычных даследаванняў" з'яўляецца дысцыплінай модуля "Прыкладная лінгвістыка". Курс знаёміць студэнтаў з гісторыяй ўзнікнення і станаўлення навуказнаўства і асноўнымі парадыгмамі сучаснай лінгвістыкі. Навуковае даследаванне ў галіне лінгвістыкі патрабуе ад даследчыка ведання метадалогіі і сучасных метадаў навуковых даследаванняў, умення выкарыстоўваць тэхналогіі сістэмнай лінгвістыкі. Акрамя таго, у навуковай літаратуры замацоўваюцца літаратурныя нормы, што спрыяе павышэнню пісьменнасці і культуры маўлення будучых настаўнікаў.

Веды асноўных тэхналогій напісання вучэбна-навуковых прац дазволяць студэнтам больш эфектыўна працаваць над курсавымі і кваліфікацыйнай працамі, выявіць у сабе здольнасці да навуковай працы, падштурхнуць студэнтаў да ўдзелу ў навуковых канферэнцыях і атрымання другой ступені вышэйшай адукацыі. Знаёмства з лекцыйным матэрыялам дысцыпліны ўдасканаліць метады даследавання ў працэсе даследчыцкай дзейнасці студэнтаў, паспрыяе дасягненню большай эфектыўнасці яго практычных вынікаў.

**Мэта выкладання дысцыпліны** "Асновы лінгвістычных даследаванняў": фарміраванне і ўдасканаленне базавых тэарэтычных ведаў у галіне лінгвістычнай метадалогіі і практычных навыкаў навуковай працы.

**Задачы вывучэння дысцыпліны:**

– сфарміраваць у студэнтаў уяўленне пра месца і ролю лінгвістыкі ў навуковым асэнсаванні свету;

– пазнаёміць з метадалогіяй і найважнейшымі метадамі мовазнаўчых навуковых даследаванняў;

– ахарактарызаваць тэхналогіі сістэмнай лінгвістыкі (тэхналогія пазнання ў лінгвістычным даследаванні і тэхналогія апісання вынікаў лінгвістычнага даследавання);

– сфарміраваць тэарэтычную базу для падрыхтоўкі студэнцкіх вучэбна-навуковых прац;

– навучыць будучых настаўнікаў самастойнай працы з інфармацыйнай літаратурай па лінгвістыцы і слоўнікамі розных тыпаў.

*Месца вучэбнай дысцыпліны ў шэрагу іншых дысцыплін.* Сярод лінгвістычных дысцыплін, якія выкладаюцца на філалагічных факультэтах ВНУ Рэспублікі Беларусь, дысцыпліна "Асновы лінгвістычных даследаванняў" займае адно з важных месцаў у сістэме падрыхтоўкі настаўнікаў-філолагаў. Гэта самастойная лінгвістычная дысцыпліна, якая мае свой прадмет вывучэння, метады і прыёмы аналізу.

*Сувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі дысцыплінамі.* Вучэбная дысцыпліна “Асновы лінгвістычных даследаванняў” звязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як “Беларуская лексікаграфія”, “Практыкум па беларускай мове”, “Уводзіны ў мовазнаўства”.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен ***ведаць***:

– асаблівасці навуковага асэнсавання рэчаіснасці;

– этапы фарміравання і развіцця навуказнаўства, асноўныя навуковыя парадыгмы сучаснасці;

– метады мовазнаўчых навуковых даследаванняў;

– тэхналогіі сістэмнай лінгвістыкі;

– тэхналогію напісання студэнцкіх вучэбна-навуковых прац;

– асаблівасці ўкаранення навуковых вынікаў даследавання ў навучальны працэс.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен ***умець***:

– выкарыстоўваць на практыцы разнастайныя метады навуковага даследавання;

– адбіраць, аналізаваць і сістэматызаваць матэрыял для навуковага даследавання;

– карыстацца разнастайнымі крыніцамі навуковай і даведачнай літаратуры;

– праводзіць самастойныя лінгвістычныя назіранні, рабіць абагульненні і вывады;

– афармляць вучэбна-навуковыя студэнцкія працы;

– рэпрэзентаваць вынікі навуковага даследавання.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен ***валодаць***:

– тыпалогіяй сучасных метадаў мовазнаўчых навуковых даследаванняў;

– тэхналогіямі сістэмнай лінгвістыкі;

– тэхналогіямі напісання студэнцкіх вучэбна-навуковых прац;

– навыкамі каталагізацыі моўных адзінак розных тыпаў.

***Базавая прафесійная кампетэнцыя*** *наступная*:

БК-адбіраць матэрыял для даследавання, вызначаць метадалогію і стратэгію даследавання, рэпрэзентаваць яго вынікі.

## Структура зместу вучэбнай дысцыпліны

Вывучэнне дысцыпліны “Асновы лінгвістычных даследаванняў” разлічана на 90 вучэбных гадзін, з якіх 50 – аўдыторныя і 40 гадзін – самастойная праца.

У аснову структуравання зместу вучэбнага матэрыялу дысцыпліны пакладзены прынцып тэматычнага падыходу, які прадугледжвае падзел вучэбнага матэрыялу на адносна самастойныя раздзелы (тэмы).

Па кожнай вучэбнай тэме ў адпаведнасці з яе мэтамі і задачамі па фарміраванні і развіцці ў студэнтаў канкрэтных кампетэнцый выкладчык (кафедра) праектуе і рэалізуе канкрэтныя педагагічныя тэхналогіі.

Найбольш перспектыўныя і эфектыўныя сучасныя інавацыйныя адукацыйныя сістэмы і тэхналогіі наступныя: вучэбна-метадычны комплекс, блочна-модульная, модульна-рэйтынгавая і крэдытная сістэмы, інфармацыйныя тэхналогіі, методыкі актыўнага навучання.

Структура зместу вучэбнай дысцыпліны ўключае ўводзіны і вучэбныя раздзелы (тэмы). Тэматычны змест вучэбнай дысцыпліны рэалізуецца ў наступных формах: лекцыйныя заняткі; практычныя заняткі, самастойная праца студэнтаў.

Форма атэстацыі: 2 семестр – ***залік.***

***Размеркаванне гадзін***

| семестр | усяго гадзін | аўдыто рныя | лекцыі | практы чныя | КСР | | самаст. праца | форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | лк | пр | | |
| 2 | 90 | 50 | 24 | 26 | – | – | 40 | залік |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## 1. УВОДЗІНЫ

Прадмет і задачы дысцыпліны “Асновы лінгвістычных даследаванняў”. Значэнне дысцыпліны, яе сувязь з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі. Агульныя заўвагі адносна праблематыкі лінгвістычнай метадалогіі. Агляд інфармацыйных крыніц па дысцыпліне.

## 2. МЕСЦА І РОЛЯ ЛІНГВІСТЫКІ Ў НАВУКОВЫМ АСЭНСАВАННІ СВЕТУ

Навуковы падыход да асэнсавання свету. Навуковае і наіўнае асэнсаванне рэчаіснасці. Крытэрыі навуковых ведаў.

Навуказнаўства і навука. Гісторыя навуказнаўства ад класічнай навукі XVII – XIX ст. да сучаснасці. Асновы, праблематыка, прынцыпы навуказнаўства. Функцыі навукі ў грамадстве. Структура навуковай дзейнасці.

Філалогія як вобласць гуманітарных ведаў, асноўныя этапы станаўлення філалогіі. Лінгвістыка як навука аб мове. Гісторыя мовазнаўства як навукі. Асноўныя раздзелы мовазнаўства. Гістарычная зменлівасць парадыгмаў у навуцы. Мовазнаўства на найноўшым этапе развіцця, яго асаблівасці, перспектывы развіцця.

Феномен роднай мовы.

## 3. МЕТАДАЛОГІЯ І МЕТАДЫ МОВАЗНАЎЧЫХ НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

**3.1. Агульная тэорыя метаду.** Сутнасць метаду і яго функцыі. Адрозненні тэорыі і метаду. Асноўныя патрабаванні, якія прад’яўляюцца да навуковага метаду. Праблема класіфікацыі і сістэматызацыі метадаў як адна з асноўных праблем тэорыі метаду.

Філасофскія метады. Натурфіласофскі метад (Рэнэ Дэкарт, Фрэнсіс Бэкан, Вільгельм Оствальд). Дыялектычны метад (Платон, Арыстоцель, І.Кант, Г.Гегель, К.Маркс). Метафізічны метад (Крытыка чыстага розуму”). Трансцэндэнтальны метад. Фенаменалагічны метад (Э.Гусэрль). Метад узыходжання ад абстрактнага да канкрэтнага. Філасофска-агульналагічныя метады і прыёмы (абдукцыя, абсалютызацыя, абстрагаванне, аналіз, аналогія, аргументацыя, дэдукцыя, доказ, ідэалізацыя, індукцыя, абагульненне, абгрунтаванне, аб’ектывацыя, тлумачэнне, азначэнне, верыфікацыя, сінтэз, параўнанне, фальсіфікацыя, фармалізацыя).

**3.2. Агульнанавуковыя метады і прыёмы даследавання.**

Метады і прыёмы эмпірычнага даследавання (навуковае назіранне, эксперымент і яго тыпы, вымярэнне, апісанне). Метады і прыёмы тэарэтычнага

даследавання (аксіяматычны метад, магчымасна-статыстычныя метады, выбарачны метад, генетычны метад пабудовы тэорый, дыяхранічны аналіз, ідыяграфічны метад, гістарычны метад, кластарны аналіз, канструктывісцкі метад, карэляцыйны аналіз, метад альтэрнатыў, метад антыномій, метад кацытавання, метад навуковага тэарэтычнага строя, метад ранжыравання, праблемны метад, прагматычныя метады, рэгрэсіўны і сінхронны аналізы, структурны метад, экстрапаляцыя і інш.). Метад мадэлявання. Гісторыя фарміравання паняццяў “мадэль” і “мадэляванне”. Структура абагульненай навуковай мадэлі. Тыпы мадэляў і этапы мадэлявання. Метады актывізацыі творчага мыслення: эўрыстычныя (мазгавы штурм, экспертны ход, сінетыка і інш.) і алгарыметрычныя метады (тэорыя вырашэння і вынаходніцкіх задач, марфалагічны аналіз). Праблема метадаў метатэарэтычнага ўзроўню навуковага пазнання. Рэфлексія як адзін з асноўных метадаў метатэарэтычнага пазнання ў навуцы.

**3.3. Дысцыплінарныя метады і методыкі сістэмнай лінгвістычнай метадалогіі.**

Лінгвістычныя асновы дысцыплінарнага метаду і методык. Моўная рэчаіснасць і дысцыплінарны метад лінгвістыкі. Дысцыплінарна-метадалагічная структура сучаснай лінгвістыкі. Тэарэтычная і прыкладная лінгвістыка. Парадыгмальны падыход у метадалогіі сучаснай лінгвістыкі. Макрапарадыгмальныя метады і методыкі лінгвістыкі. Параўнальна-гістарычны метад і яго методыкі. Лінгвістычны кампаратывізм. Агульная характарыстыка метаду. Базавыя канцэпты параўнальна-гістарычнага метаду (архетып, канвергенцыя, дывергенцыя, прамова, сям’я моў, этымон і інш.). Методыка знешняй і ўнутранай рэканструкцыі. Методыка адноснай храналогіі і глотахраналогіі. Методыкі лінгвістычнай экстрапаляцыі. Тыпалагічны метад і яго методыкі. Структурны метад і яго методыкі. Базавыя канцэпты структурнага метаду. Апазіцыйны аналіз. Дыстрыбутыўны аналіз. Аналіз па непасрэдных складніках. Трансфармацыйны аналіз. Кампанентны аналіз. Камунікатыўна-прагматычны метад і яго методыкі. Базавыя канцэпты метаду. Методыка аналізу тэксту. Методыка аналізу дыскурсу. Эвалютыўны аспект камунікатыўна-прагматычных даследаванняў. Кагнітыўны метад і яго методыкі. Ідэі, пастулаты і канцэпты метаду. Методыка аналізу канцэптаў і катэгорый (прататыпічная семантыка, фрэймавая семантыка Ч.Філмара, кагнітыўная семантыка Р.Джэкендофа і інш.).

**3.4. Метады і методыкі прыватных парадыгмаў лінгвістыкі.**

Сутнасць міждысцыплінарных даследаванняў у гібрыдных абласцях навукі. Метад і методыкі сацыялінгвістыкі. Методыкі збору сацыялінгвістычных дадзеных (назіранне, апытванне інфармантаў, эксперымент). Метад і методыкі этналінгвістыкі. Метад і методыкі арэальнай лінгвістыкі (методыка картаграфавання, прыём культурна-гістарычнай інтэрпрэтацыі, тэксталагічны прыём). Метад і методыкі псіхалінгвістыкі. Метад і методыкі нейралінгвістыкі. Нейралінгвістычнае праграмаванне. Метад і

методыкі паралінгвістыкі. Аналіз паралінгвістычных сродкаў мастацкага тэксту. Метад і методыкі лінгвакультуралогіі. Метад і методыкі міжкультурнай камунікацыі. Метад і методыкі палітычнай лінгвістыкі. Паняцце палітычнага дыскурсу. Перспектывы прыватных парадыгмаў лінгвістыкі.

## 4. ТЭХНАЛОГІІ СІСТЭМНАЙ ЛІНГВІСТЫКІ

**4.1. Тэхналогія пазнання ў лінгвістычным даследаванні.** Тэхналогія навукова-даследчага працэсу. Этапы лінгвістычнага даследавання. Праблема выбара тэмы даследавання. Планіраванне даследавання.

4.1.1. Тэхналогія пошуку навуковай інфармацыі па мовазнаўстве. Праблемны бібліяграфічны пошук. Традыцыйныя бібліяграфічныя крыніцы;. Інавацыйныя крыніцы інфармацыі.

4.1.2. Тэхналогія вывучэння навуковай літаратуры па тэме даследавання. Прачытанне навуковай літаратуры (беглае, азнаямляльнае, асэнсаванае). Запісы пры вывучэнні навуковай літаратуры (маргіналіі, разметка зыходных крыніц інфармацыі, “сістэма чыстых лістоў”, аналітычныя запісы, асноўная форма фіксацыі работы).

4.1.3. Тэхналогія збору і класіфікацыі моўнага матэрыялу па тэме даследавання. Крытэрыі адбору матэрыялу. Традыцыйныя крыніцы моўнага матэрыялу (першасныя і другасныя). Інавацыйныя крыніцы моўнага матэрыялу. Эмпірычная база лінгвістычнага даследавання.

4.1.4. Тэхналогія стварэння паняційна-тэрміналагічнага апарата даследавання. Паняцце ‘паняційна-тэрміналагічнага апарата навуковай працы. Тэхналогія мадэлявання паняційна-тэрміналагічнага апарата навуковай працы. Пабудова праблемы. Абгрунтаванне праблемы. Ацэнка праблемы. Аб’ект і прадмет даследавання. Мэта даследавання. Задачы даследавання. Гіпотэза. Параметры “дысертабельнасці” даследавання. Актуальнасць. Навуковая навізна даследавання. Тэарэтычная і практычная значымасць. Дакладнасць і абгрунтаванасць вынікаў даследавання. Апрабацыя працы.

4.1.5. Тэхналогія фарміравання метадалогіі і методыкі даследавання. Тэарэтыка-метадалагічная база лінгвістычнага даследавання.

**4.2. Тэхналогія апісання вынікаў лінгвістычнага даследавання.**

4.2.1. Тэхналогія мадэлявання навуковага тэксту па праведзеным даследаванні. Стылістычна-жанравыя асаблівасці навуковага тэксту. Паняцце стандарту навуковага стылю. Канструктыўны прынцып навуковага стылю маўлення. Кампазіцыйны стандарт жанру дысертацыі (кампазіцыя тэксту дысертацыі). Кампазіцыя тэксту аўтарэферата. Агульная характарыстыка працы. Палажэнні, якія выносяцца на абарону. Уводзіны. Асноўны змест працы. Заключэнне. Політэкстуальнасць дысертацыі. Рубрыкацыя тэксту дысертацыі. Функцыянальна-сэнсавыя тыпы маўлення ў дысертацыі з пазіцыі стандарту стылю. Мова, метамова і графічная мова дысертацыі. Моўныя перавагі навуковага стылю і жанру дысертацыі і аўтарэферата. Марфалагічныя і

сінтаксічныя асаблівасці. Нормы, правілы і тэхнікі цытавання. Сістэма бібліяграфічных спасылак і тэхніка іх афармлення. Цяжкасці і тыповыя памылкі пры апісанні вынікаў навуковага даследавання.

4.2.2. Тэхналогія рэдагавання навуковага тэксту. Паняцце самарэдагавання. Падыходы да рэдагавання тэксту дысертацыі. Прынцыпы рэдагавання навуковага тэксту. Сэнсавае рэдагаванне навуковага тэксту. Рэдагаванне дысертацыі з пазіцыі мадэлі “Якасць эталоннага тэксту”.

## 5. ТЭХНАЛОГІЯ НАПІСАННЯ СТУДЭНЦКІХ ВУЧЭБНА-НАВУКОВЫХ ПРАЦ

**5.1. Асаблівасці падрыхтоўкі навуковага артыкула.** Выбар тэмы артыкула, ацэнка навізны, актуальнасці і перспектыў навуковага даследавання. Патрабаванні да афармлення навуковых артыкулаў у навуковых перыядычных выданнях розных тыпаў і зборніках матэрыялаў канферэнцый. Выступленне з дакладам на навуковай канферэнцыі.

**5.2. Асаблівасці падрыхтоўкі рэферата.** Тыпы рэфератаў. Інфарматыўныя рэфераты (рэфераты-рэзюмэ). Індыкатыўныя рэфераты (рэфераты-канспекты). Рэфераты-даклады. Асаблівасці падрыхтоўкі рэферата. Структура рэферата. Асаблівасці напісання структурных частак рэферата: Уводзінаў, Асноўнай часткі, Заключэння. Метамова рэферата.

**5.3. Асаблівасці падрыхтоўкі і абароны курсавой працы.** Змест курсавой працы. Падрыхтоўка Уводзін. Падрыхтоўка Асноўнай часткі курсавой працы. Напісанне Заключэння да курсавой працы. Абарона курсавой працы (выступленне на абароне: асаблівасці, структура, падрыхтоўка).

**5.4. Асаблівасці падрыхтоўкі і абароны дыпломнай працы.** Змест дыпломнай працы. Падрыхтоўка Уводзін (вызначэнне аб’екта і прадмета даследавання; патрабаванні да фармулёўкі мэты і задач даследавання; тыповыя недахопы ў фармулёўцы мэты і задач даследавання). Падрыхтоўка Асноўнай часткі дыпломнай працы. Падрыхтоўка Заключэння дыпломнай працы, Спіса літаратуры, спасылак і цытат. Афармленне ілюстрацыйнага матэрыялу: рысункаў, дыяграм, табліц. Абарона дыпломнай працы (выступленне на абароне: асаблівасці, структура, падрыхтоўка).

## 6. НАВУКОВЫЯ ВЫНІКІ ДАСЛЕДАВАННЯ

Навуковыя вынікі даследавання. Навізна, верагоднасць, значнасць даследавання. Уклад у навуку. Тыповыя недахопы афармлення новых навуковых вынікаў.

Публікацыя навуковых вынікаў даследавання. Віды і формы публікацый (вучэбныя публікацыі; навукова-папулярныя публікацыі; прафесійныя публікацыі; кваліфікацыйныя публікацыі). Практычнае выкарыстанне вынікаў навуковага даследавання. Паняцце аўтарскага права ў навуцы.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| № раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Самастойная праца | Літаратура | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практ. (семінар.) заняткі | КСР | | | | |
| | | | | Лекцыі | Практ. зан. | | | |
| | | 24 | 26 | | | 40 | | |
| **1.** | **Уводзіны** | **1** | | | | **2** | | |
| | Прадмет і задачы дысцыпліны “Асновы лінгвістычных даследаванняў”. Значэнне дысцыпліны, яе сувязь з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі. Агульныя заўвагі адносна праблематыкі лінгвістычнай метадалогіі. Агляд інфармацыйных крыніц па дысцыпліне. | | | | | 2 | [1], [2] | Складанне канспекта |
| **2.** | **Месца і роля лінгвістыкі ў навуковым асэнсаванні свету** | **1** | **2** | | | **2** | | |
| | Навуковы падыход да асэнсавання свету. Навуковае і наіўнае асэнсаванне рэчаіснасці. Крытэрыі навуковых ведаў.<br>Навуказнаўства і навука. Гісторыя навуказнаўства ад класічнай навукі XVII – XIX ст. да сучаснасці. Асновы, праблематыка, прынцыпы навуказнаўства. Функцыі навукі ў грамадстве. Структура навуковай дзейнасці.<br>Філалогія як вобласць гуманітарных ведаў, асноўныя этапы станаўлення філалогіі. Лінгвістыка як навука аб мове. Гісторыя мовазнаўства як навукі. Асноўныя раздзелы мовазнаўства. Гістарычная зменлівасць парадыгмаў у навуцы. Мовазнаўства на найноўшым этапе развіцця, яго асаблівасці, перспектывы развіцця.<br>Феномен роднай мовы. | | | | | 2 | [1], дад. [2], [3] | Даклады |
| **3.** | **Метадалогія і метады мовазнаўчых навуковых даследаванняў** | **6** | **2** | | | **8** | | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3.1. | Агульная тэорыя метаду. Сутнасць метаду і яго функцыі. Адрозненні тэорыі і метаду. Асноўныя патрабаванні, якія прад'яўляюцца да навуковага метаду. Праблема класіфікацыі і сістэматызацыі метадаў як адна з асноўных праблем тэорыі метаду. Філасофскія метады. Натурфіласофскі метад. Дыялектычны метад. Метафізічны метад. Трансцэндэнтальны метад. Фенаменалагічны метад. Метад узыходжання ад абстрактнага да канкрэтнага. Філасофска-агульналагічныя метады і прыёмы. | 1 | | | | 2 | [1], дад. [1], [2], [3] | Складанне канспекта |
| 3.2. | Агульнанавуковыя метады і прыёмы даследавання. Метады і прыёмы эмпірычнага даследавання (навуковаеназіранне, эксперымент і яго тыпы, вымярэнне, апісанне). Метады і прыёмы тэарэтычнага даследавання (аксіёматычны метад, магчымасна-статыстычныя метады, выбарачны метад, генетычны метад пабудовы тэорый, дыяхранічны аналіз, ідыяграфічны метад, гістарычны метад, кластарны аналіз, канструктывісцкі метад, карэляцыйны аналіз, метад альтэрнатыў, метад антыномій, метад кацытавання, метад навуковага тэарэтычнага строя, метад ранжыравання, праблемны метад, прагматычныя метады, рэгрэсіўны і сінхронны аналізы, структурны метад, экстрапаляцыя і інш.). Метад мадэлявання. Гісторыя фарміравання паняццяў "мадэль" і "мадэляванне". Структура абагульненай навуковай мадэлі. Тыпы мадэляў і этапы мадэлявання. Метады актывізацыі творчага мыслення: эўрыстычныя (мазгавы штурм, экспертны ход, сінетыка і інш.) і алгарыметрычныя метады (тэорыя вырашэння і вынаходніцкіх задач, марфалагічны аналіз). Праблема метадаў метатэарэтычнага ўзроўню навуковага пазнання. Рэфлексія як адзін з асноўных метадаў метатэарэтычнага пазнання ў навуцы. | 1 | | | | 2 | [1], [2], дад. [1], [2], [3] | Прэзента-цыя |
| 3.3. | Дысцыплінарныя метады і методыкі сістэмнай лінгвістычнай метадалогіі. Лінгвістычныя асновы дысцыплінарнага метаду і методык. Моўная рэчаіснасць і дысцыплінарны метад лінгвістыкі. | 2 | 2 | | | 2 | [1], дад. [1], [2], [3] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Дысцыплінарна-метадалагічная структура сучаснай лінгвістыкі. Тэарэтычная і прыкладная лінгвістыка. Парадыгмальны падыход у метадалогіі сучаснай лінгвістыкі. Макрапарадыгмальныя метады і методыкі лінгвістыкі. Параўнальна-гістарычны метад і яго методыкі. Лінгвістычны кампаратывізм. Агульная характарыстыка метаду. Базавыя канцэпты параўнальна-гістарычнага метаду (архетып, канвергенцыя, дывергенцыя, прамова, сям'я моў, этымон і інш.). Методыка знешняй і ўнутранай рэканструкцыі. Методыка адноснай храналогіі і глотахраналогіі. Методыкі лінгвістычнай экстрапаляцыі. Тыпалагічны метад і яго методыкі. Структурны метад і яго методыкі. Базавыя канцэпты структурнага метаду. Апазіцыйны аналіз. Дыстрыбутыўны аналіз. Аналіз па непасрэдных складніках. Трансфармацыйны аналіз. Кампанентны аналіз. Камунікатыўна-прагматычны метад і яго методыкі. Базавыя канцэпты метаду. Методыка аналізу тэксту. Методыка аналізу дыскурса. Эвалютыўны аспект камунікатыўна-прагматычных даследаванняў. Кагнітыўны метад і яго методыкі. Ідэі, пастулаты і канцэпты метаду. Методыка аналізу канцэптаў і катэгорый (прататыпічная семантыка, фрэймавая семантыка Ч.Філмара, кагнітыўная семантыка Р.Джэкендофа і інш.). | | | | | | | |
| 3.4. | Метады і методыкі прыватных парадыгмаў лінгвістыкі.<br>Сутнасць міждысцыплінарных даследаванняў у гібрыдных абласцях навукі. Метад і методыкі сацыялінгвістыкі. Методыкі збору сацыялінгвістычных дадзеных (назіранне, апытванне інфармантаў, эксперымент). Метад і методыкі этналінгвістыкі. Метад і методыкі арэальнай лінгвістыкі (методыка картаграфавання, прыём культурна-гістарычнай інтэрпрэтацыі, тэксталагічны прыём). Метад і методыкі псіхалінгвістыкі. Метад і методыкі нейралінгвістыкі. Нейралінгвістычнае праграмаванне. Метад і методыкі паралінгвістыкі. Аналіз паралінгвістычных сродкаў мастацкага тэксту. Метад і методыкі лінгвакультуралогіі. Метад і методыкі міжкультурнай камунікацыі. Метад і методыкі палітычнай лінгвістыкі. Паняцце палітычнага дыскурсу. Перспектывы прыватных | 2 | | | | 2 | [1], дад. [1], [2], [3] | Прэзентацыя |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | парадыгмаў лінгвістыкі. | | | | | | | |
| **4.** | **Тэхналогіі сістэмнай лінгвістыкі** | **10** | **14** | | | **14** | | |
| 4.1. | Тэхналогія пазнання ў лінгвістычным даследаванні. Тэхналогія навукова-даследчага працэсу. Этапы лінгвістычнага даследавання. Праблема выбару тэмы даследавання. Планіраванне даследавання. | *6* | *10* | | | *10* | | |
| 4.1.1. | Тэхналогія пошуку навуковай інфармацыі па мовазнаўстве. Праблемны бібліяграфічны пошук. Традыцыйныя бібліяграфічныя крыніцы;. Інавацыйныя крыніцы інфармацыі. | 1 | 2 | | | 2 | [1], дад. [1] | Прэзентацыя, вуснае апытанне |
| 4.1.2. | Тэхналогія вывучэння навуковай літаратуры па тэме даследавання. Прачытанне навуковай літаратуры (беглае, азнаямляльнае, асэнсаванае). Запісы пры вывучэнні навуковай літаратуры (маргіналіі, разметка зыходных крыніц інфармацыі, “сістэма чыстых лістоў”, аналітычныя запісы, асноўная форма фіксацыі работы). | 1 | 2 | | | 2 | [1], дад. [1] | Пісьмовыя практыкаванні |
| 4.1.3. | Тэхналогія збору і класіфікацыі моўнага матэрыялу па тэме даследавання. Крытэрыі адбору матэрыялу. Традыцыйныя крыніцы моўнага матэрыялу (першасныя і другасныя). Інавацыйныя крыніцы моўнага матэрыялу. Эмпірычная база лінгвістычнага даследавання. | 2 | 2 | | | 2 | [1], [2], дад. [1], [4] | Пісьмовыя практыкаванні, даклад, вуснае апытанне |
| 4.1.4. | Тэхналогія стварэння паняційна-тэрміналагічнага апарата даследавання. Паняцце ‘паняційна-тэрміналагічнага апарата навуковай працы. Тэхналогія мадэлявання паняційна-тэрміналагічнага апарата навуковай працы. Пабудова праблемы. Абгрунтаванне праблемы. Ацэнка праблемы. Аб’ект і прадмет даследавання. Мэта даследавання. Задачы даследавання. Гіпотэза. Параметры “дысертабельнасці” даследавання. Актуальнасць. Навуковая навізна даследавання. Тэарэтычная і практычная значымасць. Дакладнасць і абгрунтаванасць вынікаў даследавання. Апрабацыя працы. | 1 | 2 | | | 2 | [1], дад. [1] | Складанне канспекта |
| 4.1.5. | Тэхналогія фарміравання метадалогіі і методыкі даследавання. Тэарэтыка-метадалагічная база лінгвістычнага даследавання. | 1 | 2 | | | 2 | [1], дад. [1] | Вуснае апытанне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 4.2. | Тэхналогіі апісання вынікаў лінгвістычнага даследавання | *4* | *4* | | | *4* | | |
| 4.2.1. | Тэхналогія мадэлявання навуковага тэксту па праведзеным даследаванні. Стылістычна-жанравыя асаблівасці навуковага тэксту. Паняцце стандарту навуковага стылю. Канструктыўны прынцып навуковага стылю маўлення. Кампазіцыйны стандарт жанра дысертацыі (кампазіцыя тэксту дысертацыі). Кампазіцыя тэксту аўтарэферата. Агульная характарыстыка працы. Палажэнні, якія выносяцца на абарону. Уводзіны. Асноўны змест працы. Заключэнне. Політэкстуальнасць дысертацыі. Рубрыкацыя тэксту дысертацыі. Функцыянальна-сэнсавыя тыпы маўлення ў дысертацыі з пазіцыі стандарту стылю. Мова, метамова і графічная мова дысертацыі. Моўныя перавагі навуковага стылю і жанру дысертацыі і аўтарэферата. Марфалагічныя і сінтаксічныя асаблівасці. Нормы, правілы і тэхнікі цытавання. Сістэма бібліяграфічных спасылак і тэхніка іх афармлення. Цяжкасці і тыповыя памылкі пры апісанні вынікаў навуковага даследавання. | 2 | 2 | | | 2 | [1], дад. [1] | Пісьмовыя практыкаванні, вуснае апытанне, даклад, прэзентацыя |
| 4.2.2. | Тэхналогія рэдагавання навуковага тэксту. Паняцце сама рэдагавання. Падыходы да рэдагавання тэксту дысертацыі. Прынцыпы рэдагавання навуковага тэксту. Сэнсавае рэдагаванне навуковага тэксту. Рэдагаванне дысертацыі з пазіцыі мадэлі “Якасць эталоннага тэксту”. | 2 | 2 | | | 2 | [1], дад. [1] | Пісьмовыя практыкаванні |
| **5.** | **Тэхналогія напісання студэнцкіх вучэбна-навуковых прац** | **4** | **8** | | | **12** | | |
| 5.1 | Асаблівасці падрыхтоўкі навуковага артыкула. Выбар тэмы артыкула, ацэнка навізны, актуальнасці і перспектыў навуковага даследавання. Патрабаванні да афармлення навуковых артыкулаў у навуковых перыядычных выданнях розных тыпаў і зборніках матэрыялаў канферэнцый. Выступленне з дакладам на навуковай канферэнцыі. | 1 | 2 | | | 6 | [1], дад. [3] | |
| 5.2 | Асаблівасці падрыхтоўкі рэферата. Тыпы рэфератаў. Інфарматыўныя рэфераты (рэфераты-рэзюмэ). Індыкатыўныя рэфераты (рэфераты-канспекты). Рэфераты-даклады. Асаблівасці | 1 | 2 | | | 2 | [1], дад. [3] | Вуснае апытанне, рэфераты |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | падрыхтоўкі рэферата. Структура рэферата. Асаблівасці напісання састаўных частак рэферата: Уводзінаў, Асноўнай часткі, Заключэння. Метамова рэферата. | | | | | | | |
| 5.3. | Асаблівасці падрыхтоўкі курсавой працы. Змест курсавой працы. Падрыхтоўка Уводзін. Падрыхтоўка Асноўнай часткі курсавой працы. Напісанне Заключэння курсавой працы. Абарона курсавой працы (выступленне на абароне: асаблівасці, структура, падрыхтоўка). | 1 | 2 | | | 2 | [1], дад. [3] | Вуснае апытанне, даклады |
| 5.4. | Асаблівасці падрыхтоўкі дыпломнай працы. Змест дыпломнай працы. Падрыхтоўка Уводзін (вызначэнне аб’екта і прадмета даследавання; патрабаванні да фармулёўкі мэты і задач даследавання; тыповыя недахопы ў фармулёўцы мэты і задач даследавання). Падрыхтоўка Асноўнай часткі дыпломнай працы. Падрыхтоўка Заключэння дыпломнай працы, Спіса літаратуры, спасылак і цытат. Афармленне ілюстрацыйнага матэрыялу: рысункаў, дыяграм, табліц. Абарона дыпломнай працы (выступленне на абароне: асаблівасці, структура, падрыхтоўка). | 1 | 2 | | | 2 | [1], дад. [3] | Даклады |
| **6.** | **Навуковыя вынікі даследавання** | **2** | | | | **2** | | |
| | Паняцце “навуковы вынік даследавання”. Навуковыя эфекты. Навізна, верагоднасць, значнасць даследавання. Уклад у навуку. Навуковыя вынікі даследавання, якія выносяцца на абарону. Тыповыя недахопы афармлення новых навуковых вынікаў. Публікацыя навуковых вынікаў даследавання. Віды і формы публікацый (вучэбныя публікацыі; навукова-папулярныя публікацыі; прафесійныя публікацыі; кваліфікацыйныя публікацыі). Практычнае выкарыстанне вынікаў навуковага даследавання. Аўтарскае права. | 2 | | | | 2 | [1], дад. [4] | Складанне канспекта |
| | ***Усяго гадзін*** | **24** | **26** | | | **40** | | ***залік*** |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Зайцева, И. П. Основы научно-исследовательской деятельности (языкознание) : учебное пособие / И. П. Зайцева. – Минск : Республиканский институт высшей школы, 2021. – 197 с.

2. Паўлоўская, Н. Ю. Метадалогія навуковага даследавання: тыпалагічны аспект : вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі / Н. Ю. Паўлоўская, В. А. Арцёмава, В. М. Гапеева. – Мінск : МДЛУ, 2018. – 147 с.

**Дадатковая літаратура**

1. Комарова, З. И. Методология, метод, методика и технология научных исследований в лингвистике : учебное пособие / З. И. Комарова. – М. : Флинта : Наука, 2013. – 818 с.

2. Медунецкий, В. М. Методология научных исследований / В. М. Медунецкий, К. В. Силаева. – СПб : Ун-т ИТМО, 2016. – 55 с.

3. Методы и средства научных исследований: учеб. пособие / Ю. Н. Колмогоров [и др.]. – Екатеринбург : Изд-во Урал. ун-та, 2017. – 152 с.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Для павышэння якасці прафесійнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў-філолагаў на працягу ўсяго тэрміну навучання ў ВНУ мэтазгодна прыцягваць кожнага студэнта да самастойнай работы. Істотнай асаблівасцю самастойнай работы з'яўляецца актыўная мысліцельная дзейнасць студэнтаў, іх імкненне выявіць свой разумовы ўзровень і стан духоўных здабыткаў у выкананні пэўных заданняў. Студэнты становяцца суб'ектамі пазнавальнай дзейнасці, у іх развіваецца ініцыятыўнасць, самастойнасць у засваенні ведаў, уменняў і навыкаў, а таксама творчае ўяўленне. Змест і формы самастойнай работы студэнтаў распрацоўваюцца супрацоўнікамі кафедры ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі адукацыйнага стандарту.

Матэрыял, рэкамендаваны для самастойнага вывучэння, студэнты павінны атрымліваць ад выкладчыка з першых тыдняў семестра. Змест матэрыялу для самастойнай працы, распрацаваны выкладчыкамі кафедры, можа ўключаць тэарэтычныя ці практычныя заданні па пэўных тэмах, комплексы індывідуальных дамашніх кантрольных работ па тэмах і раздзелах дысцыпліны. Усе віды заданняў павінны быць размеркаваны па этапах: 1) напалову самастойная (калектыўная) работа; 2) самастойная работа рэпрадуктыўнага характару; 3) самастойная работа творчага характару.

На самастойнае вывучэнне варта прапаноўваць асобныя тэмы лекцый або іх часткі па раней складзеным плане з указаннем асноўнай і дадатковай літаратуры па праблеме. Для студэнтаў першага курса рэкамендуецца выносіць на самастойнае вывучэнне тэмы і падтэмы, асноўныя палажэнні якіх вядомыя са школьнага курса беларускай мовы, або тыя пытанні, вывучэнне якіх не патрабуе валодання спецыфічнымі лінгвістычнымі ўменнямі і навыкамі. На наступных курсах матэрыял, прапанаваны для самастойнага вывучэння, варта паступова ўскладняць, але ўсё роўна змест такога матэрыялу павінен змяшчаць тэарэтычныя пытанні, успрыманне, асэнсаванне і разуменне якіх не выклікае асаблівых цяжкасцей.

Эфектыўнасць самастойнай працы студэнтаў залежыць ад многіх фактараў. Тут і аптымальны выбраная форма працы, і дакладныя, канкрэтныя ўказанні і рэкамендацыі выкладчыка па выкананні з наступнай аб'ектыўнай ацэнкай яе вынікаў і, самае важнае, сістэматычнасць і паслядоўнасць у правядзенні такой працы.

# ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫКАНАННЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

| № п/п | Назва тэмы, раздзела | Колькасць гадзін на СПС | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Уводзіны. | **2** | Падрыхтаваць канспект па тэме “Крыніцы па тэорыі навуковага даследавання” | Канс-пект |
| 2. | Месца і роля лінгвістыкі ў навуковым асэнсаванні свету | **2** | Падрыхтаваць даклады на тэмы: “Адрозненні паміж навуковым і наіўным асэнсаваннем рэчаіснасці. Крытэрыі навуковых ведаў”, “Гісторыя ўзнікнення навуказнаўства”, “Гістарычная зменлівасць парадыгмаў у навуцы” | Дакла-ды |
| 3. | Метадалогія і метады мовазнаўчых навуковых даследаванняў | **10** | Выкананне пісьмовых заданняў, стварэнне прэзентацый, падрыхтоўка дакладаў | |
| 3.1. | Агульная тэорыя метаду. | *2* | Заканспектаваць з кнігі З. І. Камаровай “Методология, метод, методика и технология научных исследований в лингвистике” (Масква, 2013) Главу 7. “Агульная тэорыя метаду”. | Канс-пект |
| 3.2. | Агульнанавуковыя метады і прыёмы даследавання. | *2* | Падрыхтаваць даклады на тэмы: “Метады і прыёмы эмпірычнага даследавання”, “Метады і прыёмы тэарэтычнага даследавання”. “Праблема метадаў метатэарэтычнага ўзроўню навуковага пазнання”. | Даклад |
| 3.3. | Дысцыплінарныя метады і методыкі сістэмнай лінгвістычнай метадалогіі. | *2* | Заканспектаваць з кнігі З. І. Камаровай “Методология, метод, методика и технология научных исследований в лингвистике” (Масква, 2013) Раздзел 12.2. “Структурны метад і яго методыкі” з Главы 12. “Макрапарадыгмальныя метады і методыкі лінгвістыкі”. Падрыхтаваць даклад пра параўнальна-гістарычны метад у | Канс-пект, даклад |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | мовазнаўстве (Ф.Боп, Р.Раск, Я.Грым, А.Х.Вастокаў). | |
| 3.4. | Метады і методыкі прыватных парадыгмаў лінгвістыкі. | *2* | Падрыхтаваць прэзентацыю “Метады і методыкі прыватных парадыгмаў лінгвістыкі” (метады сацыялінгвістыкі, этналінгвістыкі, арэальнай лінгвістыкі, псіхалінгвістыкі, нейралінгвістыкі, паралінгвістыкі, лінгвакультуралогіі, міжкультурнай камунікацыі, палітычнай лінгвістыкі). | Прэзен-тацыя |
| 4. | Тэхналогіі сістэмнай лінгвістыкі | **14** | Выкананне пісьмовых заданняў, стварэнне прэзентацый, падрыхтоўка дакладаў | |
| 4.1. | Тэхналогіі пазнання ў лінгвістычным даследаванні. | 10 | Выкананне пісьмовых заданняў, стварэнне прэзентацый, падрыхтоўка дакладаў | |
| 4.1.1. | Тэхналогія пошуку навуковай інфармацыі па мовазнаўстве. | *2* | Зрабіць прэзентацыю на тэму “Крыніцы навуковага матэрыялу: друкаваныя выданні і анлайн-рэсурсы” | Прэзен-тацыя |
| 4.1.2. | Тэхналогія вывучэння навуковай літаратуры па тэме даследавання. | *2* | Выканаць заданні па тэме “Асаблівасці працы з навуковымі крыніцамі інфармацыі” | Пісьмо-выя заданні |
| 4.1.3. | Тэхналогія збора і класіфікацыі моўнага матэрыялу па тэме даследавання ў традыцыйных і інавацыйных крыніцах моўнага матэрыялу. | *2* | Падрыхтаваць даклады на тэмы: “Традыцыйныя крыніцы моўнага матэрыялу”; “Інавацыйныя крыніцы моўнага матэрыялу” | Даклад |
| 4.1.4. | Тэхналогія стварэння паняційна-тэрміналагічнага апарата | *2* | Законспектаваць з кнігі З. І. Камаровай “Методология, метод, методика и технология научных исследований в лингвистике” (Масква, 2013) Раздзел 15.5. | Канс-пект |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | даследавання. | | “Тэхналогія стварэння паняційна-тэрміналагічнага апарата даследавання” з Главы 15. “Тэхналогія пазнання ў лінгвістычным даследаванні”. | |
| 4.1.5. | Тэхналогія фарміравання метадалогіі і методыкі даследавання. | *2* | Выканаць заданні па тэме | Пісьмо-выя заданні |
| 4.2. | Тэхналогіі апісання вынікаў лінгвістычнага даследавання | 4 | Выкананне пісьмовых заданняў, стварэнне прэзентацый, падрыхтоўка дакладаў | |
| 4.2.1. | Тэхналогія мадэлявання навуковага тэксту па праведзеным даследаванні. | *2* | Падрыхтаваць даклад на тэму “Стылістычна-жанравыя асаблівасці навуковага тэксту”; падрыхтаваць прэзентацыю “Нормы, правілы і тэхнікі цытавання. Сістэма бібліяграфічных спасылак і тэхніка іх афармлення” | Пісьмо-выя заданні, прэзен-тацыя |
| 4.2.2. | Тэхналогія рэдактавання навуковага тэксту. | *2* | Выканаць заданні па тэме “Падыходы да рэдактавання тэксту дысертацыі. Прынцыпы рэдактавання навуковага тэксту ”. | Пісьмо-выя заданні |
| 5. | Тэхналогія напісання студэнцкіх вучэбна-навуковых прац | **10** | Выкананне пісьмовых заданняў, стварэнне прэзентацый, падрыхтоўка дакладаў | |
| 5.1. | Асаблівасці падрыхтоўкі навуковага артыкула. | 6 | Выканаць заданні па тэме | Навуко-вы артыкул |
| 5.2. | Асаблівасці падрыхтоўкі рэферата. | *2* | Падрыхтоўка рэфератаў на тэмы: “Інфарматыўныя рэфераты”, “Індыкатыўныя рэфераты”, “Рэфераты-даклады” | Рэферат |
| 5.3. | Асаблівасці падрыхтоўкі курсавой працы. | *2* | Падрыхтоўка публічнага выступлення на тэму “Выступленне на абароне курсавой працы: асаблівасці, структура, падрыхтоўка” | Даклад |
| 5.4 | Асаблівасці | *2* | Падрыхтоўка дакладаў на тэмы: | Даклад |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | падрыхтоўкі дыпломнай працы. | | “Правілы афармлення Спіса літаратуры ў Дыпломнай працы”, “Правілы афармлення цытат і спасылак у дыпломнай працы” цытат”, “Правілы афармлення ілюстрацыйнага матэрыялу (рысункаў, дыяграм, табліц) у дыпломнай працы”. | |
| 6. | Навуковыя вынікі даследавання | **2** | Складанне канспекта на тэму “Аўтарскае права ў навуцы” | Канс-пект |

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ ВЫВУЧЭННЯ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

У аснову структуравання зместу вучэбнага матэрыялу дысцыпліны "Асновы лінгвістычных даследаванняў" пакладзены прынцып тэматычнага падыходу, які прадугледжвае падзел вучэбнага матэрыялу на адносна самастойныя раздзелы (тэмы).

Па кожнай вучэбнай тэме ў адпаведнасці з яе мэтамі і задачамі па фарміраванні і развіцці ў студэнтаў канкрэтных кампетэнцый выкладчык праектуе і рэалізуе канкрэтныя педагагічныя тэхналогіі.

Найбольш перспектыўнымі і эфектыўнымі сучаснымі інавацыйнымі адукацыйнымі сістэмамі і тэхналогіямі з'яўляюцца наступныя:

– тэхналогія вучэбна-даследчай дзейнасці;
– тэхналогія праблемна-модульнага навучання;
– праектныя тэхналогіі;
– інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі;
– маніторынг інтэлектуальнага развіцця і інш.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці педагогам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, вучэбна-метадычныя комплексы.

З мэтай фарміравання сучасных сацыяльна-асобасных і сацыяльна-прафесійных кампетэнцый выпускнікоў ВНУ ў практыку правядзення семінарскіх і практычных заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання і дыскусійныя формы.

# БЯГУЧАЯ АТЭСТАЦЫЯ

Бягучая атэстацыя носіць накапляльны характар, пры паспяховым выкананні бягучай самастойнай працы ў канцы семестра студэнт можа быць атэставаны аўтаматычна. Такая форма правядзення атэстацыі дазваляе матываваць студэнта да сістэмнай, планамернай працы напрацягу семестра.

У ходзе атэстацыі ацэньваюцца вынікі засваення дысцыпліны, якія праяўляюцца:

ва ўменні дакладна вызначаць асаблівасці метадаў навуковага даследавання;

ва ўменні знаходзіць і апрацоўваць навуковую інфармацыю па тэме даследавання;

ва ўменні афармляць пісьмова вынікі навуковага даследавання;

ва ўменні рэпрэзентаваць вынікі навуковага даследавання.

Акрамя таго, у ходзе атэстацыі ацэньваюцца вынікі вывучэння вучэбнай дысцыпліны, для чаго выкарыстоўваюцца заданні з мэтай праверкі ведаў па асноўных пытаннях курса.

# КРЫТЭРЫІ І ПАКАЗЧЫКІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ НА ЗАЛІКУ

| Адзнака | Крытэрыі |
|---|---|
| 10 | Студэнт свабодна валодае вучэбным матэрыялам і паказвае яго поўнае разуменне; выяўляе самы высокі ўзровень усвядомленасці вывучанага, абгрунтавана выкладае свае думкі, выкарыстоўваючы звесткі з дадатковай літаратуры, робіць самастойныя вывады і заключэнні, падмацоўвае свой адказ уласнымі ілюстрацыямі-доказамі. Аналіз моўных фактаў выкананы без памылак, што сведчыць пра ўменне прымяняць тэарэтычныя веды для вырашэння практычных задач навучання. Перадае матэрыял паслядоўна, захоўваючы нормы літаратуранай мовы; праяўляе адказнасць, пазнавальную актыўнасць і крэатыўнасць. Маўленне адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| 9 | Студэнт свабодна валодае вучэбным матэрыялам, дае поўнае азначэнне лінгвістычным паняццям, выяўляе высокі ўзровень усвядомленасці вывучанага і ўменне аргументавана выкладаць яго, падмацоўвае свой адказ яркімі ілюстрацыямі-доказамі (як з дапаможнікаў, так і самастойна падабранымі). Аналіз моўных фактаў выкананы без памылак, што сведчыць пра ўменне прымяняць тэарэтычныя веды для вырашэння практычных задач навучання. Маўленне адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| 8 | Студэнт у дастаткова поўным аб’ёме валодае вучэбным матэрыялам, самастойна абгрунтоўвае свой адказ і прыводзіць ілюстрацыі-доказы, узятыя з дапаможнікаў ці лекцый. Пры выкананні аналізу моўных фактаў дапускае асобныя недакладнасці, якія сам жа выпраўляе. Матэрыял выкладае паслядоўна, з захаваннем літаратурных нормаў; не дапускае фактычных памылак. Маўленне адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| 7 | Студэнт у дастаткова поўным аб’ёме перадае вучэбны матэрыял з асобнымі недакладнасцямі, якія выпраўляе пасля дадатковых пытанняў; можа абгрунтаваць свой адказ, прывесці ілюстрацыі-доказы; матэрыял выкладае паслядоўна з нязначнымі адхіленнямі ад літаратурнай нормы. Аналіз моўных фактаў выкананы з некаторымі памылкамі, якія выпраўляюцца самастойна. Маўленне ў асноўным адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| 6 | Студэнт перадае вучэбны матэрыял з нязначнымі памылкамі, але выпраўляе іх з дапамогай выкладчыка; тэарэтычныя звесткі падмацоўвае ілюстрацыямі, але без дастаткова глыбокага і доказнага іх абгрунтавання; дапускае недакладнасці ў паслядоўнасці выкладу матэрыялу і яго моўным афармленні. Аналіз моўных фактаў выкананы з нязначнымі памылкамі, якія выпраўляюцца самастойна. Маўленне ў асноўным адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| 5 | Студэнт ў асноўным ведае і разумее галоўныя палажэнні тэмы, але дапускае памылкі ў азначэнні паняццяў і фармулёўцы правіл, якія можа выправіць з дапамогай выкладчыка; выкладае матэрыял непаслядоўна; |

| | |
|---|---|
| | дапускае памылкі ў моўным афармленні. Аналіз моўных фактаў выкананы з памылкамі, якія выпраўляюцца з дапамогай выкладчыка. Маўленне недастаткова лагічнае і выразнае. |
| 4 | Студэнт няпоўна выкладае праграмны вучэбны матэрыял, дапускае асобныя памылкі ў азначэнні паняццяў і фармулёўцы правіл, не ўмее абгрунтаваць свае разважанні, адчувае цяжкасці пры падборы ілюстрацый; парушае паслядоўнасць выкладу матэрыялу, дапускае памылкі ў моўным афармленні адказу. Моўны аналіз выкананы з памылкамі, якія выпраўляюцца з дапамогай выкладчыка. Маўленне недастаткова лагічнае і выразнае. |
| 3 | Студэнт ўзнаўляе нязначную частку вучэбнага матэрыялу, дапускае істотныя памылкі, якія выпраўляе з дапамогай выкладчыка. Аналіз моўных фактаў не выкананы або выкананы з грубымі памылкамі. Маўленне не адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| 2 | Студэнт называе асобныя моўныя факты з вучэбнага матэрыялу, дапускае істотныя памылкі, якія выпраўляе з дапамогай выкладчыка. Аналіз моўных фактаў не выкананы або выкананы са значнымі памылкамі. Маўленне не адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| 1 | Студэнт не валодае нават асобнымі фактамі з вучэбнага матэрыялу, не ўсведамляючы іх месца ў агульнай моўнай сістэме. Аналіз моўных фактаў не выкананы або выкананы са значнымі памылкамі. Маўленне не адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

Для атрымання аб'ектыўнай інфармацыі аб ўзроўні паспяховасці студэнтаў мэтазгодна сістэматычна выкарыстоўваць розныя віды кантролю, сярод якіх: апераджальны, бягучы, тэматычны, прамежкавы і выніковы. Кожны з відаў кантролю ўжываецца на пэўным этапе навучання і выконвае ў педагагічным працэсе адну з функцый: стымулюючую, навучальную, дыягнастычную, выхаваўчую і інш.

Дыягностыка кампетэнцый па дысцыпліне можа мець розныя формы.

Вусны кантроль прадугледжвае: франтальнае, індывідуальнае, ушчыльненае (камбінаванае) апытванне на лекцыях і практычных занятках, калёквіумы, даклады на канферэнцыях, вусныя залікі і экзамены.

Пісьмовы кантроль уключае: тэрміналагічныя дыктанты, кантрольныя апытанні, кантрольныя работы, рэфераты, пісьмовыя залікі і экзамены.

Тэставы кантроль ажыццяўляецца шляхам падбору каротках адказаў у адпаведнасці з заданнямі.

# ПЕРАЛІК ТЭАРЭТЫЧНЫХ ПЫТАННЯЎ ДА ЗАЛІКУ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ “АСНОВЫ ЛІНГВІСТЫЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ”

1. Адрозненні навуковага і наіўнага асэнсавання рэчаіснасці. Крытэтыі навуковых ведаў.
2. Узнікненне навуказнаўства. Асновы, праблематыка, прынцыпы навуказнаўства.
3. Філалогія як вобласць гуманітарных ведаў, асноўныя этапы станаўлення філалогіі.
4. Лінгвістыка як навука аб мове. Гісторыя мовазнаўства як навукі.
5. Асноўныя раздзелы мовазнаўства. Гістарычная зменлівасць парадыгмаў у навуцы.
6. Агульная тэорыя метаду. Сутнасць метаду і яго функцыі.
7. Праблема класіфікацыі і сістэматызацыі метадаў як адна з асноўных праблем тэорыі метаду.
8. Метады і прыёмы эмпірычнага даследавання.
9. Метады і прыёмы тэарэтычнага даследавання.
10. Лінгвістычныя асновы дысцыплінарнага метаду і методык
11. Макрапарадыгмальныя метады і методыкі лінгвістыкі.
12. Метады і методыкі прыватных парадыгмаў лінгвістыкі.
13. Тэхналогія пазнання ў лінгвістычным даследаванні.
14. Тэхналогія пошуку навуковай інфармацыі па мовазнаўстве.
15. Тэхналогія вывучэння навуковай літаратуры па тэме даследавання.
16. Тэхналогія збора і класіфікацыі моўнага матэрыялу па тэме даследавання.
17. Тэхналогія стварэння паняційна-тэрміналагічнага апарата даследавання.
18. Тэхналогія фарміравання метадалогіі і методыкі даследавання.
19. Тэхналогіі апісання вынікаў лінгвістычнага даследавання.
20. Тэхналогія мадэлявання навуковага тэксту па праведзеным даследаванні.
21. Тэхналогія рэдактавання навуковага тэксту.
22. Тэхналогія напісання студэнцкіх вучэбна-навуковых прац.
23. Асаблівасці падрыхтоўкі навуковага артыкула.
24. Асаблівасці падрыхтоўкі рэферата.
25. Асаблівасці падрыхтоўкі і абароны курсавой працы.
26. Асаблівасці падрыхтоўкі і абароны дыпломнай працы.
27. Навуковыя вынікі даследавання. Навізна, даставернасць, значнасць даследавання.
28. Аўтарскае права ў навуцы.
29. Публікацыя навуковых вынікаў даследавання. Віды і формы публікацый.
30. Практычнае выкарыстанне вынікаў навуковага даследавання.

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, што распрацавала вучэбную праграму |
|---|---|---|---|
| "Беларуская лексікаграфія", "Практыкум па беларускай мове", "Уводзіны ў мовазнаўства" | Кафедра мовазнаўства і лінгвадыдактыкі | Дубліраванне вучэбнага матэрыялу і неістотныя супярэчнасці паміж праграмамі ліквідаваны на этапе распрацоўкі вучэбнай праграмы | Лічыць праграму узгодненай з дысцыплінамі на стадыі яе падрыхтоўкі (пратакол № 5 ад 23.11.2021) |